# З новым навучальным годам, сябры!


ГАЗЕТА ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ ФРАНЦЫСКА СКАРЫНЫ

# Гомельскі універсітэт





| № 11 (912) | ПАНЯДЗЕЛАК, 2 верасня 1996 г. | Газета заснавана ў верасні 1969 года | Выходзіць два разы ў месяц | Цана дагаворная |
|---|---|---|---|---|


## СЁННЯ Ў НУМАРЫ:


- 1 У гонар прызёраў Алімпіяды. Шчодрасць замежных сяброў.
- 2 Падпісана важнае пагадненне.
- 3 Раўняцца на лепшых студэнтаў.
- 4-5 За права стаць першакурснікамі.
- 6 Погляд у далёкае мінулае.
- 7 Год спартыўных дасягненняў.
- 8 Знаёмства з новым часопісам.


Слова да першакурснікаў

## Зрабіце правільны выбар

Сёння вы, дарагія першакурснікі, адчуваеце сябе ўжо ў новай якасці: школа -- пройдзены этап, наперадзе -- студэнцкае жыццё. А каб яно было для вас не толькі часам набыцця грунтоўных ведаў у вышэйшай навучальнай установе, але стала памятным і карысным, залежыць таксама ад таго, ці станеце вы членамі такой грамадскай арганізацыі, як прафсаюз. Менавіта ён будзе стаяць на абароне вашых сацыяльных правоў: акажа у любой складанай жыццёвай сітуацыі матэрыяльную падтрымку, забяспечыць пуцёўкамі для лячэння і аздараўлення.

Калі вы станеце членамі прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі, прафком студэнтаў універсітэта будзе выдзяляць вам на час канікулаў пуцёўкі ў санаторыі, дамы адпачынку, а таксама на працягу ўсяго навучальнага года і ў лячэбную здраўніцу ГДУ -- санаторый-прафілакторый. Тут створана добрая лячэбная база, студэнты забяспечваюцца трохразовым каларыйным харчаваннем.

Думайце і рабіце свой выбар.

**Н.КОЛТЫШАВА,**
**старшыня прафкома студэнтаў ГДУ.**

## ДАР ІТАЛЬЯНЦАЎ

Не першы год дзейнічае сумесная беларуска-італьянская праграма, па якой рыхтуюцца кадры практычных псіхолагаў з ліку студэнтаў педагагічных спецыяльнасцей ГДУ імя Ф.Скарыны, а таксама слухачоў факультэта павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў, дырэктараў школ-інтэрнатаў, дзіцячых дамоў і інш. Гэта выклікана неабходнасцю псіхалагічнай дапамогі насельніцтву Гомельшчыны, якое пражывае ў чарнобыльскім рэгіёне і адчувае пэўны маральны дыскамфорт. Згодна гэтай праграмы італьянскія вучоныя-псіхолагі плённа супрацоўнічаюць з гомельскімі навукоўцамі. Лекцыі па практычнай псіхалогіі чытае ў нашым універсітэце дырэктар дэпартамента псіхолагаў прафесар універсітэта г.Пізы Гаэтана Барлета. Гэты чалавек цікавы не толькі як вучоны, добры лектар. Ён -- асоба духоўна багатая /многія былі прыемна здзіўлены яго выдатнымі вакальнымі дадзенымі ў час выступлення на праходзіўшым сёлета ў Гомелі міжнародным маладзёжным фестывалі "Арт-сесія"/, зацікаўлена ставіцца і да праблем, якія на сённяшні дзень існуюць у нас. Так, у прыватнасці, калі Гаэтана Барлета стала вядома, што санаторый-прафілакторый ГДУ адчувае фінансавыя цяжкасці, з-за чаго не можа набыць неабходныя медыкаменты для лячэння сваіх пацыентаў, ён арганізаваў у сябе на радзіме збор добраахвотных ахвяраванняў. На сабраныя грашовыя сродкі было набыта нямала разнастайных лякарстваў, якія з гуманітарным грузам дастаўлены летам ў ГДУ яго лячэбнай здраўніцы.

**Т.ДУБЯК.**

## ПРЫЗЁРЫ АЛІМПІЯДЫ

Гэтым летам праходзіла грандыёзная спартыўная падзея -- XXVII летнія Алімпійскія гульні ў Атланце, прысвечаныя 100-годдзю алімпійскага руху.

Выдатнага поспеху дасягнула студэнтка 4-га курса факультэта фізічнай культуры нашага універсітэта Наталля Сазановіч, якая ў вельмі ўпартай барацьбе заваявала сярэбраны медаль Алімпіяды ў самай складанай лёгкаатлетычнай дысцыпліне -- сямібор'і.

...Калісьці ў Баранавічах праходзілі дзіцячыя лёгкаатлетычныя спаборніцтвы, на якіх быў трэнер з Гомеля Міхаіл Уладзіміравіч Канаплёў. Яму спадабалася светлавалосая дзяўчынка, якая добра прыгала і бегала. Паразмаўляўшы з бацькамі Наташы (маці Наташы -- інвалід, а бацька працуе на чыгунцы), ён запрасіў яе ў Гомельскае вучылішча алімпійскага рэзерва, дзе яна пад кіраўніцтвам Тамары Дзмітрыеўны Канаплёвай -- заслужанага трэнера Беларусі --удасканальвала сваё спартыўнае майстэрства.

Пасля заканчэння вучылішча Наташа паступае на факультэт фізічнай культуры нашага універсітэта.

Першая буйная перамога прыйшла да Наталлі на чэмпіянаце свету сярод юніёраў у Сеуле, а вясной гэтага года на Кубку Еўропы па лёгкаатлетычных шматбор'ях Сазановіч узнімаецца на вышэйшую прыступку п'едэстала гонару ў асабістых спаборніцтвах.

У гонар Наталлі Сазановіч і былой нашай студэнткі Наталлі Стасюк, якая заваявала бронзавы медаль ў акадэмічным веславанні, быў зроблены ўрачысты прыём у грамадска-культурным цэнтры Гомеля.

Старшыня аблвыканкома П.У.Шыпук павіншаваў нашых прызёраў з медалямі. Загадчык аддзела фізкультуры, спорту і турызму гарвыканкома А.П.Пазднякоў паведаміў на сустрэчы аб рашэнні гарвыканкома выдзеліць Наталлі Сазановіч кватэру.

Хочацца спадзявацца, што Наташа яшчэ працягне спіс сваіх перамог на лёгкаатлетычнай арэне краіны і свету.

**В.МАРЧАНКА.**

# НОВЫ ЭТАП У РАЗВІЦЦІ СУМЕСНАГА ІНСТЫТУТА

Гэтая адна з важнейшых у гісторыі ГДУ падзея адбылася сёлета, калі наша газета ужо не выходзіла. Аднак мы абавязаны звярнуцца да таго чэрвеньскага дня, каб расказаць аб ёй сваім чытачам.

Няхай ведаюць пра яе і сённяшнія першакурснікі.

Размова ідзе пра Франка-беларускі інстытут кіравання, які быў адкрыты ў мінулым годзе на базе нашага універсітэта. Гэта знайшло шырокі водгук у сродках масавай інфармацыі, што стала заканамернай з’явай. Стварэнне такога структурнага падраздзялення альма-матэр Гомельшчыны -- само па сабе вельмі ўнікальнае, бо, бадай, не мае аналагаў у свеце. Нараджэнню названага інстытута паспрыяла плённае супрацоўніцтва нашага і Оверньскага універсітэтаў.

Дагаворы аб супрацоўніцтве былі падпісаны 14 верасня 1993 года і 20 ліпеня 1995-га. Яны пасляхова ажыццяўляліся. Гэтаму актыўна садзейнічалі Міністэрства адукацыі і навукі Рэспублікі Беларусь, Міністэрства замежных спраў Францыі і яго пасольства ў Мінску.

Мэта Франка-беларускага інстытута кіравання заключаецца ў падрыхтоўцы шматпрофільных спецыялістаў і кіраўнікоў прадпрыемстваў, якія будуць валодаць навыкамі сучасных еўрапейскіх сістэм кіравання. Паміж двума універсітэтамі дасягнута дамоўленасць, што гомельскія студэнты Франка-беларускага інстытута кіравання адначасова з’яўляюцца і студэнтамі Оверньскага універсітэта з горада-пабраціма Клермон-Феран. Лепшыя выпускнікі інстытута адразу атрымаюць два дыпломы -- французскі і беларускі. Гэта прадугледжана ў падпісаным палажэнні аб названым інстытуце, якое з’явілася дапаўненнем да дагавору аб супрацоўніцтве. На падпісанне палажэння ў наш універсітэт прыбылі пасол Францыі ў Беларусі Клод Жаліф з жонкай, прэзідэнт Оверньскага універсітэта Мішэль Далі, дырэктар інстытута "Інжынерыя менеджмента" універсітэта Клермон-Феран-1 прафесар Морыс Шэневуа, прафесар Еўрапейскага гуманітарнага універсітэта А.М.Талстой, начальнік Галоўнага ўпраўлення вышэйшай адукацыі Міністэрства адукацыі і навукі Д.С.Даманеўскі, а таксама група французскіх студэнтаў, якія праходзілі практыку на гомельскіх прадпрыемствах.

На ўрачыстай цырымоніі падпісання гэтага важнага дакумента прысутнічалі старшыня Гомельскага аблвыканкома П.У.Шыпук, старшыня абласнога Савета дэпутатаў В.С.Сяліцкі, начальнік галоўнага ўпраўлення Службы кантролю Прэзідэнта Беларусі па Гомельскай вобласці Л.Н. Сечка, кіраўнік адміністрацыі Цэнтральнага раёна г.Гомеля У.У.Давідовіч.

Пры адкрыцці ўрачыстай цырымоніі акадэмік Беларускай акадэміі адукацыі, член-карэспандэнт Акадэміі навук Беларусі, прафесар, рэктар нашага універсітэта Л.А.Шаматкоў падзякаваў усіх, хто мае дачыненне да стварэння Франка-беларускага інстытута кіравання, у прыватнасці, пасла Францыі ў Беларусі Клода Жаліфа. Адзначана вялікая роля А.М.Талстога, які, будучы саветнікам па культуры пасольства Францыі, шмат зрабіў для адкрыцця і станаўлення інстытута. Леанід Аляксандравіч выказаў падзяку за падтрымку ініцыятывы Міністэрству навукі і адукацыі Рэспублікі Беларусь.

Прэзідэнт Оверньскага універсітэта Мішэль Далі ў сваім выступленні адзначыў, што ўпершыню ў гісторыі іх навучальнай установы ў якасці яе філіяла з"явілася падраздзяленне ў Беларусі, і тыя студэнты, якія навучаюцца ў нас, будуць ганарыцца тым, што ім выпаў такі гонар.

Старшыня аблвыканкома П.У.Шыпук падкрэсліў, што стварэнне Франка-беларускага інстытута кіравання значна дапаможа ў развіцці добрых адносін паміж французскім і беларускім народамі. Абмен жа студэнтамі і выкладчыкамі будзе садзейнічаць пастаяннаму ўзаемнаму інтарэсу. Ён таксама выказаў спадзяванне, што вынікі супрацоўніцтва двух універсітэтаў павінны быць яшчэ больш важкімі, чым задумвалася на першапачатковым этапе.

Начальнік Галоўнага Ўпраўлення вышэйшай адукацыі Мінадукацыі і навукі краіны Д.С. Даманеўскі адзначыў, што на падставе супрацоўніцтва двух універсітэтаў з’явяцца эксперыментальныя паказчыкі, якія можна ўкараняць у практыку.

Пасол Францыі Клод Жаліф з задавальненнем адзначыў тое, як хутка і эфектыўна пройдзены яшчэ адзін этап у развіцці Франка-беларускага інстытута кіравання. Ён таксама адзначыў вялікія і плённыя намаганні абодвух універсітэтаў і падкрэсліў, што менавіта дзякуючы іх пленнаму супрацоўніцтву ўдалося ажыццявіць такую выдатную задумку, як стварэнне Франка-беларускага інстытута кіравання.





***На здымках:* выступае пасол Францыі ў Беларусі Клод Жаліф; падпісанне дагавора.**
***Фота* М.Бяльковіча, У.Чысціка.**



Інтэрв’ю

*Калі жадаючы чалавек выбірае сабе будучую прафесію па голасу сэрца, душы, ён і вучыцца з ахвотай, ніколі не атрымае на экзаменах двоек і пасрэдных адзнак. З такіх студэнтаў трэба браць прыклад і ўсім астатнім, хто лічыць больш важнай толькі наяўнасць дыплома аб вышэйшай адукацыі, а не багатага запасу ведаў па абранай спецыяльнасці.*

*Рэдакцыя нашай газеты расказвае на сваіх старонках аб студэнтах, у якіх ёсць чаму павучыцца.*

*Сённяшняя публікацыя пазнаёміць вас з Ірынай Трохавай, студэнткай філалагічнага факультэта.*



# З ЧАГО СКЛАДАЕЦЦА ПОСПЕХ?

*(На гэта пытанне дае адказ адна з лепшых студэнтак філфака)*

**Н**а працягу 3-х год нашай сумеснай вучобы з Ірынай Трохавай мяне здзіўляла шырокае кола сяброў-студэнтаў, якія акружалі яе. Яна вясёлая, прыемная субяседніца, проста абаяльная дзяўчына. Яе дасціпны розум прываблівае не толькі равеснікаў, але і выкладчыкаў універсітэта. Ірына -- выдатніца.

-- *Іра, я лічу, што ты жывеш паўнакроўным студэнцкім жыццём. Гэта так?*

-- Для мяне сапраўднае студэнцкае жыцце -- гэта не толькі вучоба, але і ўдзел у грамадскіх справах, асабістыя інтарэсы, чым больш, тым лепш.

-- *А чаму універсітэт, філфак?*

-- Гэта не выпадкова. Спачатку была школа-ліцэй N56, і вучоба там -- гэта адны з лепшых гадоў у маім жыцці. Там я знайшла аднадумцаў, там цікава выкладалі тыя прадметы, якія мне падабаюцца больш за ўсё -- мову і літаратуру. Таму ніякіх сумненняў наконт ВНУ ў мяне не было: толькі на філфак разам са сваімі сябрамі.

-- *Што для цябе вучоба на філфаку?*

-- Гэта магчымасць атрымаць веды ў філалогіі, распачаць навуковую працу, але галоўнае -- кожны дзень бачыць разумных людзей, сяброў, якія мяне разумеюць.

-- *Іра, напэўна, выдатная вучоба патрабуе вялікіх намаганняў?*

-- Мне здаецца, што ўсё атрымліваецца само сабой, але часам і мне бывае нялёгка.

-- *Чым ты цікавішся па-за сценамі універсітэта?*

-- У мяне шмат сяброў не толькі ў Гомелі, але і ў Кіеве, Адэсе, Мінску. Люблю бываць у іх у гасцях. У вольны час наведваю тэатр, дыскатэку, выставы. Шмат часу займаюць заняткі аэробікай.

Наогул жа не люблю шалёны тэмп жыцця, мне больш па душы натуральны, павольны, каб на ўсё хапала часу.

-- *Што лічыш самай вялікай удачай у жыцці?*

-- Калі белая паласа цягнецца больш, чым чорная. Калі шанцуе не раз, і не два, а крыху больш. Калі разгледзела той шанц, які дае табе лёс, і скарыстала яго.

-- *Чаго баішся больш за ўсё?*

-- Вельмі балюча, калі страчваеш сувязь з дарагімі і блізкімі людзьмі, гэтага і баюся.

-- *Іра, ты моцны чалавек?*

-- Напэўна так, але жыццё яшчэ не раз будзе выпрабоўваць мяне.

-- *Няхай гэтых выпрабаванняў будзе менш, а студэнцкае жыццё цікавым. Гэтага хочацца пажадаць і Ірыне, і ўсім нам, студэнтам.*

**Гутарку вяла Таццяна СУСОЕВА, студэнтка гр. РБ-42 філалагічнага факудльтэта.**

**На здымку: Ірына Трохава.**
**Фота У.Чысціка.**

# КАГО ПАСЕЛЯЦЬ У ІНТЭРНАТАХ

Перад першакурснікамі, якія вытрымалі ўступныя экзамены і сталі студэнтамі універсітэта, цяпер паўстала не менш важнае па значнасці пытанне, як атрыманне месца ў інтэрнаце. Кажуць, той, хто ў ім пэўны час не пажыве, сапраўднаму і студэнцкага жыцця не зведае. Тут і радасць, і засмучэнні, падручнік ці канспект разам з аднакурснікамі, сябрамі падзеліш, ацэніш сапраўдную дружбу. Аднак, на жаль, забяспечыць цяпер усіх юнакоў і дзяўчат з сельскай мясцовасці, іншых гарадоў вобласці месцамі ў інтэрнатах магчымасці няма.

Да пачатку новага навучальнага года яшчэ па стану на 21 жніўня ў аддзел па рабоце ў інтэрнатах ГДУ ўжо было пададзена 240 заяў (уключаючы і старэйшыя курсы), а свабодных месцаў у наяўнасці -- толькі 184. Іншагародніх жа першакурснікаў налічваецца сёлета звыш 300 чалавек. Таму ў першую чаргу інтэрнат атрымаюць студэнты, якія маюць ільготы: студэнты-інваліды, сіроты; тыя, хто не мае бацькі ці маці; хто мае бацькоў-інвалідаў; юнакі і дзяўчаты са шматдзетных сем"яў (тры і больш).

Гэтым студэнтам неабходна мець пры сабе дакумент (арыгінал і копію), якія пацвярджаюць ільготы. Астатнія першакурснікі будуць засяляцца ў агульным парадку. Для гэтага неабходна падаць заяву на імя рэктара, пры сабе мець пашпарт і выклік на вучобу.

Студэнты філалагічнага, фізічнага, гісторыка-юрыдычнага факультэтаў, факультэта фізічнай культуры рассяляюцца ў інтэрнаце №1 па вул. Савецкая, 83а, замежныя студэнты, будучыя матэматыкі -- у інтэрнаце па вул. Кірава, 122а, біёлагі, эканамісты, геолагі і географы ў інтэрнаце №4 па вул. П.Броўкі, 15.

**Па ўсіх пытаннях засялення звяртацца ў аддзел па рабоце ў інтэрнатах (галоўны корпус, п. 1-16, тэл. 56-57-73).**

ДА ВЫНІКАЎ УСТУПНЫХ ЭКЗАМЕНАЎ-96

# СТУДЭНТАМ СТАЎ КОЖНЫ ДРУГІ АБІТУРЫЕНТ

На працягу другой паловы ліпеня ў нашым універсітэце, як і ў іншых вышэйшых навучальных установах краіны, у поўным сэнсе слова была гарачая пара. Ішлі ўступныя экзамены. Хваляваліся абітурыенты і, бадай, яшчэ ў большай ступені перажывалі за іх бацькі. Многія з апекуноў, бясспрэчна, маюць добрыя заробкі. Аб гэтым можна было меркаваць па шматлікіх легкавых аўтамашынах, у тым ліку і іншамарках, якія прыпаркоўваліся да вучэбных карпусоў універсітэта. Але тыя дні адышлі ў мінулае. Адным яны прынеслі радасць, другім -- засмучэнне. Мы ж мовай лічбаў раскажам аб некаторых выніках конкурсных іспытаў. Як і летась, яны былі пад наглядам прадстаўнікоў галоўнай Службы кантролю Прэзідэнта па Гомельскай вобласці. Але ўжо не такімі строгімі, як у папярэднім годзе.



Радасць ад першага экзамена.



Як бы нічога не забыць...

З улікам 114 выпускнікоў падрыхтоўчага аддзялення прыёмная камісія прыняла дакументы ад 1818 абітурыентаў пры планавым наборы на 900 месц. Дарэчы, летась на 925 месц паступала 1757 юнакоў і дзяўчат. Такім чынам, на кожнае месца прэтэндавала крыху больш за 2 чалавекі. Сёлета быў спынены набор на спецыяльнасць "Эканамічная інфарматыка". Улічваючы тое, што абітурыенты сёлета на роўных падставах маглі паступаць і ў расійскія ВНУ, а таксама шырокую сетку недзяржаўных вышэйшых навучальных устаноў, конкурс у наш універсітэт трэба лічыць высокім. Да таго ж трэба дадаць, што атэстаты сталасці 802 абітурыентаў толькі з добрымі і выдатнымі адзнакамі. Аб належным узроўні ведаў паступаючых сведчыць і той факт, што 1233 з іх вытрымалі экзамены. У працэнтных адносінах гэта некалькі вышэй, чым было у папярэднія гады.

## Конкурс узрос

Які́м жа ён быў па кожнай спецыяльнасці? Мы прыводзім дадзеныя ў параўнанні з мінулым годам. Самым высокім ён быў на спецыяльнасць "Гісторыя і нямецкая мова" -- 4,5 (2,0) чалавека на месца. Але па ёй з 18-ці прэтэндэнтаў залічылі ўсяго 4 чалавекі. Па 2,8 абітурыента на месца было на гістарычнае аддзяленне (2,2; 1,6), спецыяльнасці "Фізічная культура" (2,3), "Беларуская мова і літаратура" (2,4); 2,5 -- "Руская мова і літаратура" (3,35), 2,4 -- "Руская і беларуская мова і літаратура" (2,6), "Беларуская мова і літаратура і англійская мова" (2,2), 2,3 -- "Правазнаўства" (1,9), 2,1 -- "Нямецкая мова" (2,7), 2,0 -- "Гісторыя і англійская мова" (2,2), "Бухулік, кантроль і аўдыт" (2,0), 1,9 -- "Эканоміка і кіраванне вытворчасцю" (2,0), 1,8 -- "Прыкладная матэматыка" (1,8), "Англійская мова" (1,3), 1,7 -- "Геаграфія" (1,8), 1,6 -- "Матэматыка" (1,7), 1,5 -- "Біялогія і хімія" (1,4), "Геалогія і разведка карысных выкапняў" (2,4), "Аўтаматызаваныя сістэмы апрацоўкі інфармацыі" (1,6), 1,4 -- "Геаграфія і англійская мова" (1,8), 1,3 -- "Фізіка і тэхнічная творчасць" (1,1), 1,2 -- на педагагічны і вытворчы патокі фізічнага факультэта (1,1; 1,4).

Здзіўляе падзенне прэстыжу біялагічнага факультэта. Летась на яго залічылі абітурыентаў, якія здалі ўступныя экзамены толькі на "здавальняюча", а сёлета нават аднаго першакурсніка не дабралі. Асаблівасцю сёлетніх уступных экзаменаў з'явілася тое, што медалісты здавалі ўсе экзамены. А вось слухачы падрыхтоўчага аддзялення, якія здалі выпускныя экзамены без троек, з набранымі баламі залічаны ва універсітэт.

## Прахадны бал

Самым высокім -- 14 -- ён аказаўся на спецыяльнасцях "Беларуская мова і літаратура і англійская мова", "Правазнаўства". Нагадаем, што на апошнюю з іх у мінулым годзе было недабрана 6 чалавек. Сёлета ж лішнімі аказалася 55 абітурыентаў, якія вытрымалі экзамены. А вось на першую з названых спецыяльнасцей прахадны бал узрос на два пункты. 13 балаў дазволілі стаць студэнтамі, хто паступаў на спецыяльнасць "Гісторыя" (12), "Гісторыя і нямецкая мова" (12), "Гісторыя і англійская мова" (14), "Эканоміка і кіраванне вытворчасцю" (11), "Нямецкая мова" (12), "Прыкладная матэматыка" (10). З 12 баламі залічаны абітурыенты на спецыяльнасці "Фізічная культура і спорт" (9), "Руская мова і літаратура" (11), "Беларуская мова і літаратура" (10), "Геаграфія" (12), "Беларуская і руская мовы і літаратуры" (12). 11 балаў хапіла для таго, каб набываць веды на педагагічным патоку матэматычнага факультэта (11). 10 балаў забяспечылі паступленне на спецыяльнасці "Аўтаматызаваныя сістэмы апрацоўкі інфармацыі" (10), "Фізіка і тэхнічная творчасць" (9). Толькі са здавальняючымі адзнакамі прадставілася магчымасць паступіць на спецыяльнасць "Біялогія і хімія" (9), вытворчы і педагагічны патокі фізічнага факультэта (9) і "Геалогія і разведка карысных выкапняў" (9).

Звыш 40 абітурыентаў сталі студэнтамі з паўпрахаднымі баламі. Дадаткова да ўстаноўленага плана за аплату навучання залічаны ў ГДУ некаторыя здаўшыя экзамены абітурыенты, колькасць якіх на час падрыхтоўкі гэтага матэрыялу нам яшчэ была невядома.



Трывалыя веды на ўступных экзаменах паказаў Дзмітрый Шукаў. Праз пяць гадоў вучобы ён стане спецыялістам па дзвюх дысцыплінах -- геаграфіі і англійскай мове.



Уважліва сачыў за ходам уступных экзаменаў намеснік адказнага сакратара прыёмнай камісіі доктар тэхнічных навук, прафесар Д.Р.Лін.



Пасняхова здала ўступныя экзамены і паступіла на спецыяльнасць "Геаграфія" Наталля Осіпчык.

## Статыстыка -- для цікаўных

Сёлета ўступныя экзамены ў наш універсітэт вытрымала 1233 чалавекі, 587 здалі іх на "добра" і "выдатна" . Сярод паступіўшых -- 63% дзяўчат і 37% -- юнакоў. На спецыяльнасць "Руская мова і літаратура і беларуская мова і літаратура" залічаны толькі дзяўчаты. Усяго адзін юнак з 50-ці першакурснікаў будзе набываць веды па рускай мове і літаратуры. Амаль дзявочымі сталі і іншыя спецыяльнасці філалагічнага факультэта. А вось на спецыяльнасць "Фізіка і тэхнічная творчасць" паступіла ўсяго толькі дзве дзяўчыны. На спецыяльнасці "АСАІ" і вытворчым патоку фізічнага факультэта 84 працэнты -- юнакі, а на факультэце фізічнай культуры -- 79%.

Сярод прынятых сёлета на вучобу 684 чалавекі -- дзеці служачых, 199 -- рабочых і толькі 16 -- калгаснікаў.

832 першакурснікі закончылі школу, сярод якіх 681 атрымалі атэстаты сталасці сёлета. 238 чалавек закончылі школу з залатымі і сярэбранымі медалямі. 33 чалавекі маюць дыпломы аб заканчэнні тэхнікумаў, 8 з іх з адзнакай. 33 юнакі і дзяўчыны паступілі ў ГДУ пасля набыцця спецыяльнасцей у ПТВ. У чатырох з іх дыпломы з адзнакай.

Найбольшая колькасць медалістаў будзе вучыцца на эканамічным і матэматычным факультэтах, спецыяльнасцях "Англійская мова" і "Правазнаўства".

Сярод залічаных ва універсітэт 766 беларусаў, 111 -- рускіх, 17 -- украінцаў, чатыры чалавекі іншых нацыянальнасцей.

На першы курс паступіла 557 гамяльчан (летась было 568). 303 першакурснікі з Гомельскай вобласці, 165 -- з сельскай мясцовасці.

5 абітурыентаў залічана ва універсітэт без экзаменаў, 10 -- па-за конкурсам, 169 -- па мэтавому прыёму.

З ліку першакурснікаў 11 чалавек вучыліся ў спецыялізаваных класах, 347 закончылі падрыхтоўчыя курсы.

Ад імя рэктарата, дэканатаў, грамадскіх арганізацый і ад рэдакцыі нашай газеты горача віншуем першакурснікаў з паступленнем на вучобу ў вядучую вышэйшую навучальную і навуковую ўстанову Гомельшчыны, якая носіць імя славутага беларускага сына першадрукара і выдатнага асветніка Францыска Скарыны. Поспехаў вам, шаноўныя сябры, у набыцці абраных спецыяльнасцей і актыўнага ўдзелу ў шматгранным грамадскім жыцці ГДУ, у развіцці асабістых здольнасцей і талентаў. Усёй сваёй дзейнасцю імкніцеся абагачаць і памнажаць лепшыя традыцыі нашай альма-матэр.

**По справаздачных дадзеных прыёмнай камісіі ГДУ публікацыю падрыхтаваў У.Балога.**

**Фота У.Чысціка.**

За радкамі гісторыі

# УНІЯЦТВА НА ГОМЕЛЬШЧЫНЕ

***Правядзеннем Міжнароднай навуковай канферэнцыі 8-9 кастрычніка г.г. у Брэсце будзе адзначацца 400-годдзе Брэсцкай уніі па прабleме "Брэсцкая унія 1596: тэалогія, палітыка, культура". На ёй плануецца абмяркоўваць пытанні аб уплыве уніяцтва на працэсы тэалогіі, палітыкі, адукацыі і самасвядомасці беларусаў.***

Зразумелы інтарэс грамадскасці да гэтай праблемы і на Гомельшчыне. У дадзеным артыкуле кранемся аднаго з яе пытанняў -- тэалогіі.

Тэалогія -- гэта багаслоўе, іншымі словамі царкоўнае вучэнне аб Богу і рэлігійных дагматах -- галоўны прадмет выкладанне ў духоўных навучальных установах.

Уніяцтва -- гэта агульная назва хрысціянскіх царкоўных арганізацый, якія ўзніклі ў выніку пагадненняў (уній) аб аб'яднанні каталіцызма з іншымі хрысціянскімі вераваннямі. Брэсцкая унія 1596 г. -- гэта пагадненне аб аб'яднанні на тэрыторыі Рэчы Паспалітай праваслаўнай царквы з каталіцкай ва ўмовах прызнання вяршэнства рымскага папы і асноўных догм каталіцкай царквы, з захаваннем праваслаўных дауніяцкіх абрадаў і богаслужэння на царкоўнаславянскай мове. Брэсцкая унія была зацверджана каралём Зігмундам III. Яе мэта -- замацаванне пазіцый каталіцкай царквы на Беларусі і Украіне, паланізацыя беларускага і ўкраінскага народаў.

Уніяцтва на Гомельшчыне звязана з доўгай і ўпартай барацьбой праваслаўя супраць Ватыкана і польскіх феадалаў, якія навязалі Брэсцкую унію 1596 г. Як гэта адбывалася?

Папства імкнулася перадолець раздробленасць хрысціянства і стварыць адзіную рэлігію на чале з Ватыканам.

Гомель увайшоў у склад беларуска-літоўскага княства ў 1355 годзе. Тады Гомель уяўляў сабой тыповы ўдзельны гарадок, які знаходзіўся на крутым беразе Сожа, а гамяляне ўжо не называлі сябе радзімічамі, а проста -- беларусамі. Гамяляне займаліся хлебаробствам, пчалярствам, паляваннем на пушнога звера, бабровымі гонамі па Сажы, рамяством і вялі гандаль з Чачэрскам, Старадубам і Кіевам, куды збывалі лодкі.

Літоўцы жылі ў дружбе з беларусамі, прынялі ад іх хрысціянства і звычаі, карысталіся беларускай мовай, дазвалялі беларусам займаць пасады.

Летам 1490 г. беларуска-літоўскі вялікі князь Аляксандр у Вільні пацвердзіў прыехаўшаму з Гомеля ўдзельнаму князю Сямёну права на Гомель, Старадуб і Чарнігаў, але меў добрыя адносіны да палякаў і схіляў свайго васала гомельскага князя Сямёна да прыняцця каталіцызма. Апошні звярнуўся да Маскоўскага вялікага князя Івана III і папрасіў абароны. І ў красавіку 1500 г. Гомель з навакольнымі валасцямі далучыўся да Маскоўскай дзяржавы. Але на Гомельшчыне паўтараліся пагранічныя крадзяжы штогод як з боку маскоўскіх гасудароў, так і з боку Літоўскага. Гэты край пакрывалі лясы, у Сожы з прытокамі вадзіліся нястомныя бабры, берагі рэк і азёраў заліваліся мёдам дзікіх пчол, у лясах было шмат птушак і ўсякага звяр'я -- ласёў, дзікіх кабаноў, мядзведзяў, барсукоў... Было што рабаваць: край багаты.

Пасля аб'яднання Польшчы і Літвы пад скіпетрам Літоўскай дынастыі палякі хутка пачалі перасяляцца на беларускія землі, якія належалі Літве, і ўсюды з поспехам выцяснялі літоўцаў.

Гомель, які тады належыў літоўцам, фактычна зноў аказаўся пад уплывам польскіх улад, "законаў, дзяржаўнага ладу. Многія беларускія сем'і перасяліліся пад Маскоўскую дзяржаву, захаваўшы вернасць веры, звычаям, моўнай блізкасці.

Прыехаўшы ў Гомель з Польшчы князь Ян Дарашэвіч не ўзлюбіў беларускіх свяшчэннікаў, адабраў у іх землі, чыніў крыўды і прыцясняў сялян, уводзіў новыя павіннасці. Насаджалася польскае землеваладанне шляхам раздачы палкоўнікам, ротмістрам, харунжым польскага гарнізона земляў з замацаванымі сялянамі. Каралі даравалі ўдзелы шляхцічам у "кармленне" за службу.

У апошнія сто гадоў польскай улады на Гомельшчыне для прыцягнення гамялян на свой бок каралі давалі ім прывілею на неабмежаванне гандлю і бяспошлінны правоз тавараў. Але на мытнях парушаліся гэтыя прывілеі, па-ранейшаму прыцяснялі гамялян. Прыцясняліся ўсе, хто не належыў да польскай нацыянальнасці і каталіцкай рэлігіі. Вынікі былі наступныя: толькі казакі ў 1684г. з'явіліся пад Гомелем, як усе гомельскія вёскі на левым беразе Сожа адпалі ад Польшчы і далучыліся да казакаў. Праз 25 гадоў пасля перамогі рускіх войскаў над войскамі шведскага генерала Левенгаупта, гамяляне звярнуліся да Пятра I, просячы абароны ад засілля пані Красінскай, якая прымушала праваслаўных да прыняцця уніі, а калі праваслаўныя аказвалі супраціўленне, то Красінская выгнала з Гомеля праваслаўнага протаіерэя, захапіла саборную царкву Святога Мікалая, авалодала сярэбраным начыннем і царкоўнымі рэчамі, стала прымушаць людзей да уніі пабоямі і рознымі мучэннямі. Тады праваслаўныя гамяляне прынеслі на яе скаргу ў Пецярбург Пятру I. Цар заступіўся ў 1720 г. за гамялян і прадставіў каралю мемарыял з запрашэннем спыніць гэтыя несправядлівасці і папярэдзіў, што, калі гэтыя ганенні працягнуцца, то гэта можа стаць прычынай непрыемнасцей.

Так як царква заставалася ў руках уніятаў, то праваслаўныя гамяляне задумалі пабудаваць новую каменную царкву. Супраць гэтай задумы быў князь Красінскіх, і пабудова гэта не адбылася.

У 1737 г. згарэлі ўсе праваслаўныя цэрквы на Гомельшчыне. Іезуіт Рушыцкі ад уніі прыклаў усе намаганні, каб не дапусціць пабудовы праваслаўных цэркваў. Гамяляне засталіся без праваслаўных храмаў. Адышлі да уніі Шэрсцінская, Радоўская, Варамееўская і Навасёлкаўская цэрквы ў 1737 г., а ў 1738 г. была адабрана царква ў Хальчы. З 1734 г. па 1743 г. у беларусаў на Гомельшчыне было адабрана 128 храмаў, і за кароткі тэрмін 140 дваранскіх прозвішчаў у Літве прынялі каталіцтва.

Але і Польшча каціласся да свайго закату: паны захоплівалі цэлыя вобласці, нападалі адзін на аднаго, вялі траўленне беларусаў, яўрэеў, немцаў -- праваслаўных, лютэран і кальвіністаў. Кароль уціхамірваў сваіх сваявольных паноў пры дапамозе наёмных іншаземных (рускіх, аўстрыйскіх, прускіх) войскаў, якія хацелі аднавіць парадак у Польшчы. У 1772 г. Кацярына II далучыла да Расіі Беларусь, а з ёю і Гомель.

Такім чынам, уніяцтва на Гомельшчыне мела палітычны працяглы драматычны характар, адлюстравалася ў гэтым працэсе развіццё самасвядомасці беларусаў.

**М.ДЗМІТРЫЕЎ,**
**прафесар, доктар педагагічных навук, акадэмік Міжнароднай акадэміі акмеалагічных навук.**



# Да вынікаў спартыўнага года

Усе спаборніцтвы ў 1995-96 навучальным годзе праходзілі скрозь прызму Алімпійскіх гульняў ў г.Атланце.

І пачалі навучальны год студэнты нашага універсітэта ўпэўнена. Студэнтка факультэта фізічнай культуры Людміла Падасенка на чэмпіянаце Еўропы па батуце ў каманднай барацьбе заняла II месца і ўпершыню выканала нарматыў майстра спорту міжнароднага класа Рэспублікі Беларусь.

Праз дзень, падтрымаўшы яе пачын, студэнт гэтага ж факультэта Руслан Кашперка стаў чэмпіёнам Еўропы.

22-24 верасня ў г.Мадрыдзе праходзіла першынство Еўропы па дзюдо, дзе Сяргей Кухарэнка заняў трэцяе месца і ўзнагароджаны бронзавым медалём.

У лістападзе ў праграме спартакіяды РБ па ручному мячу выяснялі свае адносіны зборныя каманды абласцей і горада Мінска. Мужчыны занялі II месца (трэнер В.В.Марчук), жанчыны -- трэцяе (трэнер В.П.Крукоўскі). Зборныя поўнасцю ўкамплектоўваліся студэнтамі нашага універсітэта.

На чэмпіянаце РБ па дзюдо 10-12 снежня ў г.Мінску паспяхова выступіў студэнт факультэта фізічнай культуры Сяргей Кухарэнка, які заняў першае месца і ўпершыню выканаў нарматыў майстра спорту.

2-3 лютага ў г.Мінску праходзіў зімовы чэмпіянат РБ на прызы газеты "Спортивная панорама", у якім вельмі паспяхова выступалі нашы студэнты, а для Наталлі Сазановіч гэта быў вынік падрыхтоўчага перыяду перад галоўнымі змаганнямі. 100 метраў з бар'ерамі яна пераадолела за 13.20 сек., а ў даўжыню скакнула на 6.50 см. Падтрымалі паспяховы пачатак Наталлі і іншыя нашы студэнты. Першае месца занялі: Аляксандр Слюнькоў ў бегу на 200 м, Аляксандр Цітоў на дыстанцыі 400 метраў, а другой была Наталля Салагуб. Аляксандр Цітоў у бегу на 800 м заняў трэцяе месца.

На чэмпіянаце РБ па вольнай барацьбе паспяхова выступілі Аляксандр Гузаў і Сяргей Дземчанка. Яны занялі першыя месцы. Бронзавыя медалі заваявалі Валерый Кандраценка і Аляксандр Савін.

9-11 лютага ў г.Гродне праходзіў мемарыял імя Я.Карбышава, у якім выступаў студэнт першага курса факультэта фізічнай культуры Сяргей Бурмістраў. Ён заняў першае месца і ўпершыню выканаў нарматыў майстра спорту.

# ЁСЦЬ КІМ ГАНАРЫЦЦА

У лютым у лёгкаатлетычным манежы "Дынама" праходзіў Кубак РБ па лёгкай атлетыцы. У складзе зборнай вобласці, якая на палову складзена са студэнтаў факультэта фізічнай культуры, Аляксандр Слюнькоў у бегу на 100 метраў заваяваў залаты медаль, сярэбраныя медалі на рахунку Аляксандра Цітова і Алены Кандраценка.

На адкрытым чэмпіянаце Расіі па лёгкай атлетыцы паспяхова выступіў Аляксандр Слюнькоў, які заняў першае месца ў бегу на 200 метраў і ўпершыню выканаў нарматыў майстра спорту міжнароднага класа РБ, паказаўшы высокі вынік -- 21.30 сек.

На рэспубліканскіх студэнцкіх гульнях каманда нашага універсітэта па паўэрліфтынгу заняла трэцяе агульнакаманднае месца, а Сяргей Гуцаў -- першае. Трэцім быў Андрэй Садоўскі. Гэта несумненны поспех іх трэнера Уладзіміра Аляксандравіча Галавача, старшага выкладчыка кафедры фізічнага выхавання.

II мая ў г.Гомелі праходзіў Кубак РБ па лёгкай атлетыцы. Першыя месцы занялі Наталля Сазановіч, Аляксандр Слюнькоў, Алена Бычкоўская, другія -- Уладзімір Грыцэвіч, які ўпершыню выканаў нарматыў майстра спорту РБ, Аляксандр Цітоў, Наталля Салагуб, Таццяна Гулевіч, трэція -- Наталля Салагуб і Сяргей Цішкоў.

19 мая ў Мілане прайшоў Кубак Еўропы па лёгкай атлетыцы сярод клубных каманд. На гэтых спаборніцтвах Алена Бычкоўская ў бегу на 1500 метраў заняла другое месца, Наталля Салагуб на дыстанцыі 100 метраў і Таццяна Гулевіч у скачках у даўжыню былі пятымі.

23-24 мая ў г.Мінску ў праграме Рэспубліканскіх студэнцкіх гульняў прайшлі спаборніцтвы па лёгкай атлетыцы. Каманда ГДУ заняла ганаровае другое месца пасля Акадэміі фізічнага выхавання і спорту, праіграўшы ёй усяго 32 ачкі. Юлія Паспелава ў бегу на 100 метраў з бар'ерамі і ў скачках у даўжыню стала пераможцай і ўпершыню выканала нарматыў майстра спорту РБ. Валянцін Борсук у бегу на 100 і 200 м таксама выканаў нарматыў майстра спорту РБ і заваяваў пуцёўку на чэмпіянат свету сярод юніёраў, які адбудзецца ў г.Сіднеі. Вышэйшыя ўзнагароды заваявалі таксама Наталля Салагуб у бегу на 100 і 200 метраў. Хутчэй за ўсіх пераадолелі Аляксандр Цітоў 400 і 800 м, Сяргей Цішкоў -- 1500 і 3000 метраў, мацнейшымі сталі Таццяна Гулевіч у скачках у вышыню, Алена Бычкоўская ў бегу на 800 і 1500 метраў, Юрый Лекуновіч у дзесяцібор'і, Наталля Сазановіч у сямібор'і. Былі другімі Алена Кандраценка ў бегу на 100 м з бар'ерамі і ў скачках у даўжыню, Яўген Пудакоў у кіданні дыска, Уладзімір Грыцэвіч у кіданні кап'я, трэцім -- Яўген Пудакоў у штурханні ядра. У цікавай спартыўнай барацьбе ў эстафетным бегу 4х400 м наша каманда заняла другое месца сярод мужчын.

У Мадрыдзе 1-2 чэрвеня адбыўся Кубак Еўропы па лёгкай атлетыцы. У складзе зборнай РБ выступала і Алена Бычкоўская. У бегу на 1500 метраў яна заняла чацвёртае месца з вынікам -- 4.12,67.

Добра выступілі і нашы весляры на байдарках і каноэ. Яны таксама занялі другое месца пасля Акадэміі фізічнага выхавання і спорту, а па колькасці медалёў занялі першае месца. Найбольш паспяхова выступілі Сяргей Лаўніковіч, які заваяваў тры залатыя медалі. Такі ж багаж золата ва Уладзіміра Калесніка. У Сяргея Верaксіча -- два залатыя медалі, Зоі Гручанковай -- адзін. Сярэбраныя медалі заваявалі Алена Бялова і Ганна Арэшка -- двойчы і Дзмітрый Крупскі. Бронзавы медаль у Аляксандра Рунова.

Кубак Еўропы па лёгкаатлетычнаму сямібор'ю 15-16 чэрвеня прайшоў у Германіі. У складзе зборнай РБ выступала наша Наталля Сазановіч. Наперадзе Беларусі ў камандным заліку аказалася толькі зборная Германіі. У асабістым заліку першы прыз у Наталлі Сазановіч -- 6466 ачкоў.

21-22 чэрвеня ў Гомелі адбыўся адкрыты чэмпіянат РБ па лёгкай атлетыцы, на якім залатыя медалі заваявалі Наталля Сазановіч і Алена Бычкоўская. Апошняя ўпершыню выканала нарматыў майстра спорту міжнароднага класа РБ у бегу на 800 м. Сярэбраныя медалі дасталіся Таццяне Гулевіч, Юліі Паспелавай, бронзавыя -- Аляксандру Цітову, Наталлі Салагуб, Валянціну Борсуку.

Усе мы з нецярпеннем чакалі вестак з далёкай Атланты. Наталля Сазановіч уключылася ў барацьбу толькі 27-28 ліпеня. Сярод сяміборак яе вынік быў лепшым у свеце. І можна смела сказаць, што Наталля не разгубілася ў лёгкаатлетычных сектарах, выступаючы з вядомымі спартсменкамі свету, і заваявала сярэбраны Алімпійскі медаль. З гэтым яе сардэчна віншуюць кіраўніцтва нашага універсітэта, дэканат і студэнты факультэта фізічнай культуры, спартыўны клуб. У яе перамозе вялікая заслуга трэнераў мужа і жонкі Т.Д. і М.В.Канаплёвых, а таксама старшага выкладчыка кафедры лёгкай атлетыкі і лыжнага спорту В.К. Кірэева.

**У.ЛЕМЯШКОЎ,**
**дырэктар спартыўнага клуба, кандыдат педагагічных навук.**

# ПАРТРЭТ Ф.СКАРЫНЫ -- АД АНГЛІЙСКАГА МАСТАКА

Такі падарунак музею Ф.Скарыны цвёрда паабяцаў зрабіць Маколм Роузі, архітэктар і мастак з г. Бірмінгема, які гэтым летам пабываў у нашым універсітэце. Ён прыязджаў у Гомель разам са сваёй жонкай Элізабет Розендэйл, якая на працягу тыдня ў чэрвені праводзіла заняткі па нямецкай мове для студэнтаў эканамічнага факультэта.

Гэтая сямейная пара шмат падарожнічае па свеце, і М.Роузі, як чалавек творчы, цікавіцца мастацтвам, культурай тых народаў і краін, дзе бывае. Вось і на гэты раз у нашым горадзе ён пазнаёміўся з палаца-паркавым ансамблем Гомеля, пабываў у Веткаўскім музеі народнай творчасці, вялікую цікавасць праявіў таксама да музея Ф.Скарыны ГДУ, дзе яго работнікі расказалі яму пра вялікага беларускага асветніка і першадрукара. Асабліва ўважліва ён агледзеў тут карціны аб ім.

-- Гэты музей стаў для мяне вялікім адкрыццём за час майго знаходжання ў Гомелі, -- сказаў М.Роузі. -- У мяне ўзнікла ідэя намаляваць партрэт Ф.Скарыны і падараваць яго вашаму універсітэцкаму музею.

Гость з Англіі папрасіў яму даць з сабой для выканання гэтай работы некаторыя рэпрадукцыі партрэта Ф.Скарыны.

Будзем спадзявацца, што дадзенае абяцанне М.Роузі абавязкова стрымае і экспазіцыя музея папоўніцца яшчэ адным цікавым экспанатам.

**Т.ДУБЯК.**

# "ПАЛЕССЕ" -- НОВЫ РЭГІЯНАЛЬНЫ ЧАСОПІС

З Рыгорам Андрэяўцом мы знаёмы даўно. Ён закончыў наш універсітэт. Акрамя філалагічнай адукацыі, атрымаў багаты журналісцкі вопыт. Доўгі час працаваў на журналісцкай ніве, некалькі гадоў рэдагаваў гарадскую газету "Гомельскія ведамасці". Сёлета Р.Андрэявец стаў заснавальнікам і галоўным рэдактарам літаратурна-гістарычнага і грамадска-культурнага часопіса "Палессе".

Р.Андрэявец не часты госць нашай рэдакцыі. Але калі ён заходзіць да нас, заўсёды дзеліцца сваімі задумкамі, планамі. Апошняя сустрэча была вельмі прыемнай. Калега зайшоў у рэдакцыю і па-чалавечу шчыра падпісаў на ўспаміны першы нумар свайго выдання.

Часопіс "Палессе" выгадна адрозніваецца ад іншых кніжак такога тыпу сваёй высокамастацкай паліграфічнай афармленасцю. І вельмі прыемна было ўзяць яго ў рукі.

Перагортваем старонкі. Першыя тры з іх звернуты да ўвагі чытачоў. Выдавец і рэдактар тлумачыць назву часопіса. Гэта звязана з тым вялікім і прыгожым краем, што ляжыць на поўдні Беларусі і ахоплівае нізінныя прасторы басейна Прыпяці, сярэдняга Дняпра і Сожа. Наш край геолагі недарма называюць скарбніцай беларускай зямлі. З усіх прыродна-гаспадарчых раёнаў паўднёвая Беларусь найбольш багатая карыснымі выкапнямі. Тут знойдзены радовішчы нафты, калійнай і спажыўнай соляў, гаручых сланцаў, бурага вуглю, граніту, бурштыну.

Першыя старонкі часопіса займаюць вершы Міхася Башлакова, які нарадзіўся ў Гомельскім раёне і атрымаў дыплом нашага універсітэта, выдаў пяць паэтычных зборнікаў, цяпер працуе галоўным метадыстам арганізацыйна-метадычнага цэнтра па выданню гісторыка-дакументальных хронік Памяці Дзяржкамітэта па друку Рэспублікі Беларусь.

Паколькі часопіс з'яўляецца рэгіянальным, у ім апублікаваны мастацкія творы аўтараў з сумежных абласцей Браншчыны і Украіны.

З цікавасцю чытачы азнаёмяцца з прозай і паэзіяй.

Ёсць і публікацыі дацэнтаў кафедры беларускай літаратуры нашага універсітэта. У прыватнасці, адна з іх -- кандыдата філалагічных навук В.І.Смыкоўскай. Яна апавядае пра вечарыну, прысвечаную памяці выдатнага сына палескай зямлі Івана Паўлавіча Мележа. Ёсць тут і цікавае паведамленне дацэнта названай кафедры В.С.Новак.

Новы часопіс выйшаў тыражом 1500 экземпляраў. На пачатку ён распаўсюджваецца ў розніцу, але, думаецца, у яго з'явіцца намнога больш прыхільнікаў, і ў недалёкім будучым гэта выданне будзе распаўсюджвацца і па падпісцы.

**Б.ВАЛОДЗІН.**

# ДЗЯРЖАЎНАЯ АДУКАЦЫЯ ПЕРАСТАЕ БЫЦЬ БЯСПЛАТНАЙ

У 1996/97 навучальным годзе дзяржаўныя ВНУ Беларусі папоўняць 30 тысяч студэнтаў-першакурснікаў. 23 тысячы з іх будуць атрымліваць адукацыю бясплатна, а 7 тысячам за набыццё ведаў давядзецца плаціць.

Варта заўважыць, што на працягу некалькіх гадоў у дзяржаўных ВНУ адбывалася пашырэнне практыкі навучання на платнай аснове, а сёлета з іх упершыню былі зняты ўсялякія абмежаванні на платны набор студэнтаў.

Найбольшая колькасць "платных" студэнтаў на сённяшні дзень атрымліваюць адукацыю ў Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь і ў Беларускім дзяржаўным эканамічным універсітэце. А вось самая высокая плата за навучанне ўстаноўлена флагманам айчыннай навукі -- Беларускім дзяржаўным універсітэтам.

Асаблівасцю будучага навучальнага года стане зніжэнне колькасці студэнтаў, якія вучацца завочна: у працэнтных суадносінах яны складаюць менш за 40 працэнтаў ад агульнай колькасці першакурснікаў. А вось вячэрняя форма навучання, відаць, неўзабаве наогул перастане існаваць: вячэрнія аддзяленні захаваліся толькі ў лічаных ВНУ.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**
**("Звязда", № 203).**

**ГОМЕЛЬСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ імя Ф.СКАРЫНЫ**

аб'яўляе конкурс на замяшчэнне вакантных пасад па кафедрах:

-- педагогікі -- дацэнта;
-- геаэкалогіі -- асістэнта;
-- рускага, агульнага і славянскага мовазнаўства -- заг.кафедры;
-- алгебры і геаметрыі -- заг.кафедры.

Тэрмін падачы заяў -- не пазней 1 месяца з дня апублікавання паведамлення.

Заявы накіроўваць на адрас: 246699 г.Гомель, вул.Савецкая, 104.

**РЭКТАРАТ.**

Аўтары надрукаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць прыведзеных фактаў, цытат, эканамічных даных, асабістых імён, геаграфічных назваў і іншай інфармацыі, а таксама за тое, каб у матэрыялах не ўтрымлівалася даных, якія не падлягаюць адкрытый публікацыі. Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы ў парадку абмеркавання, не раздзяляючы пункту гледжання аўтара.

ЗАСНАВАЛЬНІК -- Гомельскі дзяржаўны універсітэт імя Ф.Скарыны.

Наш адрас: 246699, г. Гомель, вул. Савецкая, 104, пакой 1-18, тэл. 57-43-21.
Рэгістрацыйны № 221

Спонсар газеты -- прафком студэнтаў.

Газета набрана і зверстана на настольна-выдавецкім комплексе ІВЦ ГДУ, аддрукавана на фабрыцы "Палесдрук", г.Гомель, вул. Савецкая, 1.

Рэдактар
Ул.П. БАЛОГА

Аб'ём 1 друк. арк.
Тыраж 1.500 экз.
Заказ 430
Падпісана да друку 28.08.96.